© PDF: Kamunikat.org 2013

# ДУМКІ й ПАГЛЯДЫ

Дадатак да «Беларускага Сьвету», № 1.

## ПРА БЕЛАРУСКІХ РЭНЭГАТАУ... НА ЭМІГРАЦЫІ

Бійце ў сэрцы іх — бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

«Пагоня» — М. Багдановіч

Нядаўна прачытаныя мною «Адказы, заўвагі й пабочныя думкі» рэдактара «Беларускага Сьвету» навялі мяне на сумны роздум. Важную й балючую тэму закрануў рэдактар «Б. С.»

У 269-ым № газэты «Беларус» за 1979 г. быў зьмешчаны артыкул ейнага галоўнага рэдактара, сьв. пам. Др. Станіслава Станкевіча пад заг. «На 69-я ўгодкі ад сьмерці Івана Луцкевіча», у якім у заканчэньні чытаем наступнае:

Сяньня беларускае грамадзтва ў абставінах эміграцыйнага жыцьця, стаўшыся ў вялікай сваёй часьці зматэрыялізаваным, убогім і дробязным у сваіх духовых аспірацыях, ня толькі ня можа ў сваіх радох знайсьці людзей гэткае глыбокае ідэйнасьці й самаахвярнасьці, але ня здольнае нат уявіць сабе велічы нацыянальных змагароў гэткага маштабу й духовае моцы, якімі былі браты Іван і Антон Луцкевічы».

Сумная праўда. Але яшчэ сумней, што сярод беларускай нацыянальна сьведамай і актыўнай палітычнай эміграцыі зьявіліся рэнэгаты. Рэнэгаты былі ўва ўсе часы й сярод усіх паняволеных народаў...

Чалавек есьць, каб жыць, але ня жыве дзеля таго, каб толькі есьці. «Не хлебам адзіным жыве чалавек», сказана ў Эвангельлі. Адзін праваслаўны царкоўны герарх на эміграцыі прыраўнаў людзей, якія з усяго задаволеныя й нічога больш ня шукаюць, да сьвіньней каля карыта. Сёньняшні папа Ян Павал II, у сваёй кнізе «Чалавек і дзеяньне» пісаў, што паасобны чалавек ня можа знайсьці задаваленьня толькі ў самым сабе ці нават у прыналежнасьці да пэўнай сацыяльнай групы. Чалавек павінен зьвярнуцца да чалавечае натуры кажнай іншай асобы сваім дзеяньнем. Чалавек, які дзейнічае ў свабодзе, можа знайсьці задаваленьне толькі ў добрадзеяньні. Толькі запраўды дзейны чалавек ёсьць маральна вартаснай асобай. Толькі ў маральным сэньсе дзейны чалавек ёсьць запраўднай людзкой асобай.

Сярод беларускай палітычнай эміграцыі, як і сярод кажнай іншай, ёсьць сёньня нажаль нямала такіх асобаў, якія ў канцы Другой сусьветнай вайны пакінулі Бацькаўшчыну ня дзеля зарабляньня грошай. Яны ратавалі сваю свабоду й сваё жыцьцё, каб жыць, працаваць і змагацца ў краінах вольнага сьвету за свае нацыянальныя ідэалы, але апынуўшыся на чужыне, асабліва тыя, што апынуліся ў Паўночнай Амэрыцы, з часам перайшлі ў далярова-спажывецкую катэгорыю



© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

людзей. Карацей кажучы — сталіся абжорамі. Іх нічога беларускага ўжо ня цікавіць: ні свая царква, ні свая арганізацыя, ні беларуская газэта ці кніга, ні беларускія нацыянальна-культурныя імпрэзы. Яны не адчуваюць ніякай духовай патрэбы. Іх цікавіць толькі матэрыяльны бок жыцьця. Жывуць толькі для сябе і, напоўніўшы свой жывот, чуюцца шчасьлівымі. Але гэтых абжораў нельга назваць рэнэгатамі, бо яны, хоць і ня прыносяць ніякай карысьці беларускай справе, але ёй і ня шкодзяць. Таксама нельга назваць рэнэгатамі тых Беларусаў на чужыне, што ня прышчапілі беларускасьці сваім дзецям, якія пабеларуску нават не гавораць, хоць зьява гэтая вельмі балючая.

Тых, якіх можна назваць рэнэгатамі ў поўным сэньсе гэтага слова, сярод беларускай эміграцыі вельмі мала. Але яны, на вялікі жаль, ёсьць. Гэтыя адзінкі, адцураўшыся ўсяго беларускага, прымкнулі да Расейцаў або Палякаў, належаць да іхных грамадзкіх арганізацыяў і царкоўных парахвіяў. Я ведаю аднаго здольнага беларуса ў Амэрыцы, які раней быў актыўным у беларускім грамадзка-нацыянальным і царкоўным жыцьці, лічыў сябе беларускім патрыётам (і я яго за такога ўважаў), але зь бегам часу, здабыўшы вышэйшую асьвету і атрымаўшы добра платную працу ды ажаніўшыся з расейкай, ім быць перастаў. Ды ня толькі перастаў, але і адцураўся ўсяго беларускага. А адцураўшыся, прымкнуў да Расейцаў: упісаўся й належыць да парахвіі варожай да беларушчыны — Расейскай Зарубежнай царквы. Перад знаёмымі Беларусамі хваліцца, як найвялікшым сваім дасягненьнем, собскім 14-ціпакаёвым домам, паказваючы яго каляровую фотаздымку. Апраўдваючы свой адыход ад беларускасьці, гэты рэнэгат і матэрыяліст у адной асобе кажа: «А што-ж мне Беларусы далі?!» Камэнтары, як кажуць, тут лішнія, але як тут усё-ж не прыгадаць словаў паэты Гальляша Леўчыка зь ягонага вершу, якімі я хачу закончыць мае разважаньні: «Хто адрокся сваіх, і цурацца нас стаў, хто прыліп да чужых, каб ён сьвету ня знаў».

Уладзімер Брылеўскі

## КРЫХУ ПРА МОВУ...

...А цяпер крыху пра мову. Нядаўна атрымаў я кнігу твораў А. Салаўя. І вось пра адну недарэчнасьць я хачу ўспамянуць.

Мяне няпрыемна ўразіла такое напісаньне слоў: ў вабставінах, ў васысьце. ў васэнсаваньні, ды ўсюды, дзе прыназоўнік «у» стаіць перад словам, якое пачынаецца з літары «а». Паводля гэткага «правіла» трэба было-б пісаць — ў Вамілі, ў Вальжбеты, або — ў Вадама, ў Вантона ці ў Вастапа, або — ў Вамэрыцы, ў Вафрыцы, ў Вазіі і г. д.

Вось тут мне ўспамінаецца, як яшчэ ў 1918 годзе, пры рэдактары Я. Лёсіку я быў карэктарам газэты «Вольная Беларусь». Аднойчы наведаў рэдакцыю Б. Тарашкевіч і пачаў выясьняць Лёсіку памылку прафэсара Карскага, які ў сваёй кнізе «Белоруссы» напісаў: «Пераход славянскага «л» у беларускае «ў» кароткае. Тымчасам расейскі прафэсар Шахматов зрабіў папраўку прафэсару Карскаму, што гэтае «л» пераходзіла фактычна ў «в», а «в» стаўшы паміж галосным і зычным гукам, не вымаўлялася выразна, а неяк скарочана, падобна да няпоўнага «у». Гэтак паўстала «ў» кароткае. Таму Лёсік, пасьля размовы з Тарашкевічам сказаў мне: «Трэба ведаць, што «ў» кароткае — гэта ня што іншае, як скарочанае «в». Таму недарэчнасьць пісаць: «ў вабставінах, ў васысьце, ў Вамэрыцы», бо пішам прыназоўнік «в» у форме «ў» кароткага, а потым да слова, якое пачынаецца з літары



© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

«а», дабаўляем яшчэ раз гэтае «в», і фактычна атрымліваецца: в вабставінах, в васысьце, в васэнсаваньні. І гучыць гэтае выслаўленьне ня надта гладка. А калі напісана: «ў асэнсаваньні», то водгук гэтага «в» (ці «ў» кароткага) паўстае сам сабою пры чытаньні, — і слова ня разіць няпрыемнасьцяй...

Міхась Міцкевіч

## ЯНКА КУПАЛА і ЯКУБ КОЛАС

Як бліскавіца праносіцца па небе, так пранясласся вестка па Беларусі, што Янка Купала зрабіў спробу самагубства. Народ быў напружаны, народ хваляваўся. Заправілы чорнымі справамі сядзелі на бочцы пораху. Адна іскра й Беларусь можа ўзарвацца ад гневу. Народ чакаў, што будзе далей. Янка Купала выздаравеў. Народ пачаў пакрысе ўспакайвацца.

Янка Купала і Якуб Колас шчыра любілі сваю Бацькаўшчыну-Беларусь. Яны езьдзілі па ўсёй краіне й часта іншыя беларускія паэты далучаліся да іх. Аднойчы Янка Купала і Якуб Колас адведалі Стары Быхаў і Баркалабаўскі манастыр, дзе знаходзілася шмат розных летапісаў. Куды-б ня ехалі Янка Купала і Якуб Колас, — за імі заўсёды сьлядзіла група тайных агентаў-чэкістаў. Агенты не давалі паэтам нават адкрыта пагаварыць з людзямі.

За Старым Быхавам ёсьць курган, дзе пахаваны жаўнеры, якія змагаліся супраць Масквы. Гэты курган часамі называлі Касьцюшка. Ля гэтага кургана, будучы малым хлапцом, я спаткаў Я. Купалу і Я. Коласа.

Кажуць, што ў часе II-ой Сусьветнай вайны Я. Купалу і Я Коласа сілаю вывезьлі зь Менску ў Маскву. Янка Купала адтуль больш ужо не вярнуўся. Цікава ведаць, як ён загінуў у Маскве?!

Няхай вечна жыве сьветлая памяць сярод нас пра Янку Купалу і Якуба Коласа.

Васіль Косараў

---

Гэты выпуск нашага часапісу — «Беларускі Сьвет» у сваёй большай частцы сфінансаваў ведамы беларускі гісторык і дабрадзей, Сп. Часлаў Будзька. За гэта яму вялікая й шчырая падзяка.

Наступнае выданьне нашага часапісу заплянована на восень. Матэрыялы прызначаныя ў восеньскі № часапісу, трэба перасылаць не марудзячы. Матэрыялы апрацоўваць просім сьцісла, зьвязла й праўдзіва.

## БЕЛАРУСЫ не вераб'і й чучалаў не баяцца...

Нейкі бастонскі хапун-адвакацік у супалцы з яшчэ адным шукальнікам розных людзкіх сплетняў з сеткі TV — «стукнулі» па беларускай эміграцыі ніжэй пояса.

Гэты жуліцкі ўчынак выклікаў бурную рэакцыю сярод беларускае эміграцыі. Пасыпаліся пратэсты, тлумачэньні, выясьненьні (і ўсё гэта не патрэбна, бо тлумачыць няма каму й няма патрэбы) і ідыёцка-рэнэгацкія зацемкі, як прыкладам у «Б. Голасе», дзе напісана: «І



© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

добра сталася, бо якраз перад Сёмухай паявіліся ў тэлевізіі й газэтах ведамыя **разаблачэньні** аб бэцээраўскім Урадзе, Прэзыдэнтах і Міністрах, абзываючы іх нацыстамі і больш». (падкрэсьленьне наша). Трэба спадзявацца, што рэдактар гэтае газэты ў наступным № дасьць нейкае тлумачэньне адносна гэтае нізкае, дурное й тыпічна правакацыйнае зацемкі.

Уся гэтая шуміха нагадвае мне буру ў шклянцы вады, і таму праймацца такою лухтою няма ніякае патрэбы.

З прыемнасьцю трэба адзначыць, што беларуская эміграцыя горда прыняла гэты нізкі ўдар і адмахнулася ад яго, як адмахваюцца ад гадкае, натарчывае мухі.

Застрашыць Беларусаў «нацыстамі» або «камуністамі» ніколі й нікому ня ўдасца. Беларусы людзі адважныя й пры патрэбе могуць так умела адмахнуцца, што некаму забаляць зубы. Трэба заўсёды памятаць, што Беларусы перажылі не адно «лета гарачае» — тым больш перажывуць і гэтае «г. сабачае».

Н.

## НОВАЕ літаратурна-навуковае выданьне.

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва выдаў чарговы, ёмісты том паэзіі, — гэтым разам збор твораў Алеся Салаўя. Як ведама, першым такім томам, была выбраная паэзія Натальлі Арсеньневай.

Адразу заўважаю, што на маю думку, з усяе навукова-культурнае дзейнасьці нашае эміграцыі, — гэтыя выданьні займаюць першае, пачэснае мейсца ў культурным даробку беларускае эміграцыі й зьяўляюцца выдатным укладам у скарбніцу беларускае культуры наагул. Бяз сумліву гэтымі выданьнямі Беларусы могуць заслужана ганарыцца й цешыцца.

Таксама хочацца пры гэтым зазначыць і пажадаць, каб разумна запачаткаваная Інстытутам выдавецкая праца на ніве беларускае літаратуры станоўча прадаўжалася й прыскорвалася. Бо-ж ёсьць на эміграцыі яшчэ шмат чаго да выданьня, навуковае апрацоўкі ды ўдумлівага адбору ўсяго найлепшага. Выглядае, што фінансавы бок справы таксама на добрай дарозе. Застаецца толькі чакаць на чарговы том выданьня Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва.

Рэдактар «Б. С.»

...Пры розных спатканьнях і гутарках, калі парушаецца справа пісаньня «Успамінаў» даводзіцца надта часта чуць: «А на што пісаць гэтыя «Успаміны», і якая з гэтага карысьць?..»

Кажны ўспамін мае сваю вартасьць, карысьць, патрэбнасьць і гістарычную важнасьць. Выказваць успамянутыя засьцярогі можа толькі чалавек «неабчэсаны» й зь мелкім разумаваньнем. Мне здаецца, што калі-б М. Абрамчык, Р. Астроўскі, Др. Станкевіч ды іншыя напісалі свае «Успаміны» ды іх выдалі, цяпер да іх асобаў не чапляліся-б розныя цемрашалы й прайдзісьветы...

П. К.

---

Артыкулы ў «ДУМКІ й пагляды» ня могуць быць доўгімі ды абы якімі. Ананімных дапіскаў да друку ня прымаем.



© PDF: Kamunikat.org 2013